АЛЕСЬ БАЧЫЛА

ДЗЯЎЧЫНЦЫ

Прабач ты мне — ты ж іншым прабачала, –
Што незнарок убачыў, на бяду,
Як носам боціка на снезе ты пісала:
“І не звані — я болей не прыйду!!!”

Тры клічнікі, як тры слупы ганебы,
Паставіла крыўдзіцелю свайму...
Хоць ён і дабратой тваёй пагрэбаў,
Усе ж магла ты дараваць яму
І доўгае чаканне, і завею.
І несуцешнай чорнай здрады зло,
Бо нездарма ж
з апошняю надзеяй
Ты азірнулася.
О, як я разумею,
Што на душы тады ў цябе было...

І адзінокая, сама сабе не рада, —
Не раз і я ў жыцці такое знаў -
Пабегла ты...
А снег кружыўся, падаў
І словы першай крыўды засыпаў.
Калі ж з вачэй маіх і ты прапала,
Да звыклых боляў твой дадаўся боль,
І ўжо завея з неба асыпала
На раны мне не белы снег, а — соль.

1970